**Аўтар**: Зайцаў Ігар Андрэевіч, 15 гадоў; ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі", 9 клас; тэл. 8 033 642 67 61 (МТС); 223944 Мінская в., Капыльскі р., аг.Пясочнае, в. Садовая, 14; elena.maysyuk@gmail.com

**Намінацыя «Нам ёсць з каго браць прыклад»**

# Маўчанне пра вайну

Родны кут мой багаты на ўспаміны –
Дзе ні пройдзеш – то сэрца баліць,
З бабуляй-суседкай сустрэнешся мілай –
У размовах мінулае ўваскрасіць.

Белы свет, белы дзень, белы май,
Белы бусел над вёскаю кружыць,
Пабелена хата, пабелены сад,
Фотаздымкі на белым, чыстым  абрусе.

«Прадзед твой слаўным быў кавалём,
Моцным, мудрым і надта ўдалым,
Сто сяброў меў харошых, ўсміхаўся ўсім,
Вітаўся рукою шырокаю, з мазалямі.

Прадзед твой век сумленна пражыў
З суседзямі, з роднымі ў згодзе,
Улюбёны ў працу, у свой небасхіл,
У дом свой, у поле, у бяседу да ночы.

На майскія святы збіраецца "ў людзі"  -
На мітынг у Лавы  ідзе пехатой,
Медалі прышпіліць, звіняць яны слаўна
Пра сціплую мужнасць пяюць між сабой".

Словы бабулі,  як сіняга Нёмана дар,
Цякуць, даруючы светлага  суму павеў
Бо прадзеда я хоць жывым і застаў,
Але не многа ў той час разумеў.

А зараз хацеў бы абняць, распытаць,
Да цёплых плячэй яго прытуліцца,
Медалі разглядзець, у руках патрымаць,
Да світанку ўволю нагаманіцца.

"Не гаварыў наш каваль пра вайну,
Як не прасі – не дапрасіцца,
Толькі адвернецца - слёзы ў вачах
Блішчаць, як з нябёсаў вадзіца..."

Маўчанне пра вайну… Я адчуваю:
Яно вышэй самых высокіх слоў:
Калі сяброў хаваеш пасля бою,
Душа знямее, мову заняло…

Калі пажарышча на месцы вёскі той,
Што родная сястра жыла, убачыш,
Замрэш, застынеш, на калені ўпадзеш,
І нема закрычыш, і ў другі раз памрэш!

Чацвёрты раз выходзіш з акружэння,
Страчаеш здраду, маладушша і адчай,
Згаладаешся, шукаеш цеплыню ў снезе, –
На Галгофу ўзыходжанню пад стаць!

Мы ведаем вайну не па расказах
нашых прадзедаў, прапрадзедаў, дзядоў,
Што сэрцамі, крывёю  баранілі
Айчыну, родны край для нас з табой.

На старым фотаздымку – юнак малады
Дзевятнаццаць гадочкаў ад роду,
Акуратна прычэсаны валасы,
свежы погляд вачэй і ўсмешка праз годы.

Героі – ў кожнай беларускай сям'і,
І памяць пра подзвігі іх не загасне!
Няма мовы ў мёртвых,  у  іх
Ёсць дзеці, ўнукі, ёсць  мы,

Каб перадаць усяму чалавецтву
Туды, дзе раптоўна ўспыхваюць войны,
Святасць Міру,  Цану Іх Перамогі,
У самых гучных паэтычных словах.

Работа выполняется в компьютерном наборе в соответствии со стандартными требованиями форматирования, располагается на одной стороне листа формата А4 (210x297), применяется гарнитура шрифта Times New Roman размером 14 пунктов с использованием межстрочного интервала 18 пунктов (один межстрочный интервал) с выравниванием текста по ширине листа. При выполнении работы соблюдаются поля: левое – 30 мм, правое – 10 мм, верхнее – 20 мм, нижнее – 20 мм. Объем работы – не более одной страницы. Творческая работа должна содержать следующую информацию: Ф.И.О. автора полностью, возраст, учреждение образования, класс, контактный телефон, адрес, электронная почта. Работа должна быть выполнена с соблюдением орфографических, пунктуационных, грамматических, речевых норм.